# АСНОУНЫЯ ПЕРАДУМОВЫ ФАРМІРАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ Ў XIX СТАГОДДЗІ

**Р. А. Колас**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*kolosrodion@mail.com;*
*навук. кір – Т. А. Навагродскі, д-р гіст. навук, праф.*

У дадзеным артыкуле разглядаюцца асноўныя перадумовы і прычыны закладзеныя ў XIX стагоддзі, якія склалі падмурак для фарміравання беларускай нацыі. Даследваюцца ў рэтраспектыве па тром асноўным накірункам: моўным, культурным і свядомасна фарміруючым працэсам з ужываннем комплекснага падыхода шляхам рэалізацыі на аснове прынцыпу ўсебаковасці, які прадугледжваў вычляненне і вывучэнне ў чыстым выглядзе кожнага з бакоў прадмета даследавання.

***Ключавыя словы:*** Нацыя; мова; культура; свядомасць; беларусы.

Сучаснае беларускае грамадства знаходзіцца на шляху набыцця і ўсведамлення сябе ў якасці самастойнай нацыі ў сусветным кантэксце. Прычына гэтага: нядаўняе аднаўленне Беларуссю незалежнасці. Для разглядання асноўных передумоў фарміравання беларускай нацыі было ўзята XIX стагоддзе, якое характарызуецца як час станаўлення ў Еўропе нацый і нацыянальных дзяржаў, вялікай колькасцю рэвалюцый, рэфармацыйных рухаў, нацыянальнымі ўздымамі і «вяртаннем сабе свайго імя», што ў буйной ступені закранула Беларусь. Менавіта ў гэты час пачынаецца сцвярджэнне і фарміраванне асноўных передумоў для абвяшчэння ў XX стагоддзі дзяржавы, аднаўленне незалежнасці і выхад на міжнародную арэну.

У канцы XIX – першай чвэрці XX стагоддзя імкліва развіваўся індывідуалізм, што адбівалася на самаідэнтыфікацыі асобы. Такому развіццю больш за ўсё спрыяла лацінскае веравызнанне (галоўным чынам пратэстантызм), чым праваслаўнае, хуткае развіццё капіталізму, чым існаванне перажыткаў феадалізму, шматлікі пласт мяшчан (на чале з буржуазіяй), чым сялянства (на чале са шляхтай) [8, с. 49–51].

Для акрэслівання складу насельніцтва Беларусі ў XIX стагоддзі аналізаваліся дадзеныя перапісу насельніцтва 1897 года. У Беларусі беларускамоўнае насельніцтва складала 73,3 %. Другое месца належала мове габрэяў – 14 %. Рускамоўнае насельніцтва склала 4,3 %, польскае – 2,4 % [9, с. 23]. А таксама 43 % саслоўя дваран прызналі сябе беларусамі, акрамя таго, 60 % настаўнікаў, 40 % чыноўнікаў лічылі беларускую мову роднай [4, с. 18].

На складзе насельніцтва адбіваўся фактар памежжа. Ён выразна прасочваецца ў Віцебскай губерні. Тут зафіксавана найбольш удзельная вага рускамоўнага насельніцтва – 9,9 %. Для параўнання, у Гродзенскай

губерні гэты паказчык склаў 4,3 %, Мінскай – 3,9 %, Магілёўскай – 3,4 %, у Віленскай – 2,6 %. Адметны факт, што ў Мінскай губерні была зафіксавана найбольшая ўдзельная вага польскамоўнага насельніцтва – 3 %. У Магілёўскай губерні ён быў роўны 1 %, у двух іншых – больш аптымальным – 2,5 % у Віцебскай і 2,8 % у Віленскай губерніях. Што тычыцца канфесійнай прыналежнасці, для жыхароў беларускіх зямель больш традыцыйным стала вызнаваць праваслаўе. Праваслаўнымі прызнала сябе 70,8 % насельніцтва. Найбольшая вага праваслаўных у Магілёўскай губерні – 83,1 %, некалькі больш, чым прызнавалі беларускую мову сваёй роднай (82,4 %). Насельніцтва Віленскай губерні менш за ўсё падтрымлівала агульную для беларускіх зямель праваслаўную традыцыю: тут аказалася 41,4 % праваслаўных і 80,2 % беларускамоўных. Другой па распаўсюджанасці рэлігіяй сярод жыхароў беларускіх земляў быў юдаізм: яго вызнавалі 14,1 % насельніцтва краю. [6, с. 136–137]. Рымска-каталіцкая царква, па выніках перапісу, была трэцяй па колькасці грамадзян, вызнаваўчых яе на беларускіх землях. Іх было некалькі менш, чым юдзеяў, – 13,5 %. Прыналежнасць да рымска-каталіцкай царквы ў большасці выпадкаў не была для беларусаў асновай іх самаідэнтыфікацыі з польскім этнасам. Так, у Віленскай губерні 46,1 % яе насельніцтва лічылі сябе каталікамі, аднак польскую мову прызнавала роднай толькі 2,8 %. У Мінскай губерні перапіс зафіксаваў 10,1 % каталікоў і толькі 3 % польскамоўных [9, с. 25–26].

У 1839 годзе імператар Мікалай І забараніў ужываць так званую «народную гаворку». У верасні 1859 года расійскія ўлады забаранілі друк па-беларуску лацінскім алфавітам, называючы яго «польскім шрыфтам», каб зменшыць уплыў польскага боку на беларускае насельніцтва. У межах агульнага павароту расійскай палітыкі друк па-беларуску быў забаронены цалкам у 1867 годзе. [10, с. 445].

У нацыянальна-культурным руху Беларусі не магло не заняць выключна важнага месца змаганне за адпаведную яе інтарэсам адукацыю. Асноўнымі тыпамі школ у сістэме пачатковай адукацыі ў сельскай мясцовасці станавіліся народныя вучылішчы, царкоўнапрыходскія школы і школы граматы, а у гарадах – прыходскія, павятовыя і гарадскія вучылішчы. Сотні маладых людзей вучыліся ва ўніверсітэтах Еўропы, а ў заможных сем’ях навучаннем дзяцей займаліся хатнія настаўнікі. Свой узнёсак у развіццё адукацыі і культуры ўносілі царкоўныя братэрствы і розныя манаскія ордэны. Адкрываліся новыя навучальныя ўстановы свецкага характару [7, с. 48–53].

Напярэдадні новай школьнай рэформы 1860-х гадоў у Беларусі налічвалася 576 навучальных устаноў усіх тыпаў. У іх навучалася каля 17 тысячаў чалавек. Пачатковай адукацыяй у народных вучылішчах

і царкоўнапрыходскіх школах у гэты час было ахоплена 216 тысяч дзяцей. Удзельная вага пісьменных людзей на тэрыторыі Беларусі складала на той час 25,7 %, а ў вёсцы – 16 %. Па часе правядзення рэформа супала з паўстаннем 1863–1864 гг., таму масавыя рэпрэсіі закранулі і сістэму адукацыі: былі закрыты Горы-Горацкі земляробчы інстытут і 8 сярэдніх навучальных устаноў Віленскай навучальнай акругі, у тым ліку навагрудская гімназія, свіслацкая і маладзечанская прагімназіі. Каля 2 тысяч навучэнцаў былі выключаны са школ. Але разам з барацьбой з польскім уплывам расійскі ўрад развіваў такім чынам і сістэму рускамоўнай адукацыі. З 1860 па 1881 колькасць школ павялічылася ў 3,8 разоў (з 576 да 2185). Узровень пісьменнасці быў вышэй, чым у астатніх частках Расіі: 32 % у 1897 годзе ў параўнанні з 27,9 % ва Украіне і 29,6 % у рускіх губернях [5, с. 75].

У першай палове XIX стагоддзя мастацкае знаёмства беларускага народа праяўлялася ў фальклоры. Найбольш значныя плёны беларускай ананімнай літаратуры – гэта паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе». «Энеіда навыварат» – першая буйная эпічная вытворчасць новай беларускай літаратуры. Сваімі каранямі «Энеіда навыварат» сягае да «Энеіды» Вяргілія [2, с. 32–34].

Вельмі доўгі час беларускае насельніцтва называла сябе «ліцвінамі» і «тутэйшымі». Але ўжо ў першай палове XIX стагоддзя ў творчасці пэўных прадстаўнікоў беларускай інтэлектуальнай эліты маюць месца спробы ідэнтыфікацыі народа, аддзялення яго спачатку ад палякаў, а пазней ад рускіх і літоўцаў. Гэтыя спробы падмацоўваюцца канстатацыяй адрозненняў у гістарычнай спадчыне народа, у яго традыцыях, звычаях, асаблівасцях фальклору і мове. Невыпадкова, што гісторыя і культура народа становяцца асноўнымі аб’ектамі даследаванняў грамадска-палітычных дзеячоў, навукоўцаў, літаратараў і нацыянальных мысляроў [3, с. 205].

Да XIX стагоддзя ў якасці саманазвы ўжываўся этнонім «русіны» або палітонім «ліцвіны», але нягледзячы на гэта ў большай ступені была распаўсюджана назва «ліцвіны» сярод больш адукаванай і свядомай праслойкі грамадства [1, с. 158].

У XIX стагоддзі адной з найгалоўнейшай праявай свядомасці беларускага насельніцтва было паўстанне 1863–1864 гадоў, калі кіраўнік паўстання Кастусь Каліноўскі ўпершыню голасна абвесціў сябе беларусам, а сваю мову беларускай. У сваіх «Лістах з-пад шыбеніцы» Кастусь Каліноўскі пакідае духоўны запавет беларускаму народу, дакладна размяжоўвае разуменне польскага паўстання, маскалей і мужыкоў-беларусаў. Дзякуючы гэтым з’явам і праявам індывідуальнай свядомасці, якая знаходзіла водгук у насельніцтва альбо фарміравала яе

ў яго, да канца XIX стагоддзя тэрмін «беларус» і назва мовы «беларускай» замацавалася за насельніцтвам ўсёй тэрыторыі Беларусі і рассялення беларусаў [11, с. 162].

У беларускай свядомасці XIX стагоддзя вылучаліся розныя сацыяльна-класавыя арыентацыі і адпавядаючыя ім падыходы да разумення сябе, свайго грамадства і дзяржавы, праблем успрымання духоўнай спадчыны мінулага, суіснавання розных канфесій. Асноўнымі перадумовамі для фарміравання беларускай нацыі ў XIX стагоддзі былі: удасканальванне беларускай мовы і з'яўленне літаратурнай мовы даступнай народу праз апавяданні пра ягонае жыццё; развіццё сістэмы адукацыі, што спрыяла росту зацікаўленасці да народнай культуры; этналагічнае і мастацка-літаратурнае апісанне беларусаў свядомай часткай насельніцтва, што стварала базу для навуковай апрацоўкі.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Бандарчык В. К.* Фарміраванне і развіццё беларускай нацыі / В. К. Бандарчык, П. У. Церашковіч // Этнаграфія беларусаў. – Мн. : Навука і тэхніка, 1985. – С. 168.
2. *Блінава Э.* Лінгвістычны аналіз паэмы «Энеіда навыварат» // Роднае слова. – 2005. – № 12. – С. 45.
3. *Вішнеўская І. У.* Палітычная і прававая думка Беларусі на мяжы еўрапейскіх цывілізацый (IX – пачатак XXI стст.). Мн: Тэсей, 2008. – С. 203–210.
4. *Дубянецкі Э. С.* Нацыянальная самасвядомасць беларусаў у мінулым і сення // Адукацыя і выхаванне, 1996, № 3. С. 18.
5. *Запруднік, Я.* Беларусь на гістарычных скрыжаваннях / Навук. рэд. У. Арлоў; пер. з англ. М. Раманоўскага. Мн.: ВЦ «Бацькаўшчына»: Беларускі Фонд Сораса, 1996. – 264 с.
6. Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны: навук. зб. Вып. 5 / Рэдкал. У. Н. Сідарцоў (адк. рэд.), С.М. Ходзін (нам. адк. рэд.) [і інш.]. Латышева В. А. Переписи населения 1897 и 1926 гг. : признаки национального самоопределения белорусов. – Мн.: БГУ, 2009. – С. 187.
7. *Лыч Л.* Беларуская нацыянальная ідэя: тэарэтычны і практычны аспекты / Леанід Лыч. Мн.: Навука і тэхніка, 2010. – 447 с.
8. *Радзік Р.* Самаідэнтыфікацыя беларусаў і украінцаў: падобнае і адрознае // ACLS Annual Regional Meeting of the Humanities Program in Belarus, Russia, and Ukraine. Minsk, 2003. С. 119.
9. *Эбэрхардт П.* Дэмаграфічная сітуацыя на Беларусі. 1897 – 1989. Б.: Беларускі Фонд Сораса, 1997. – 282 с.
10. *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі:* У 6 т. Т. 5. М – Пуд / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мн.: БелЭн, 1999. – 592 с.
11. Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенэз, этнічная гісторыя / В. К. Бандарчык, І. У. Чаквін, І. Г. Углік [і інш.]. – Мн.: Навука і тэхніка, 1985. – 215 с.